У якіх народных і аўтарскіх казках вы сустракаліся з вобразамі зайца, вожыка і ваўка? Якімі рысамі характару яны звычайна надзелены? Што можаце сказаць пра характар казачнай вавёркі?

На аснове загалоўка і ілюстрацыі паразважайце пра тэму аўтарскай казкі Васіля Гурскага. Хто з герояў у ёй будзе дзейнічаць?

***Небара́ка*** — *(размоўнае)* няшчасны, варты спагады, спачування чалавек.
***Памярко́ўны*** — які лёгка прыстасоўваецца да іншых, добразычлівы.

## ВЕРНЫЯ СЯБРЫ

*Васіль Гурскі*

Жыў у лесе Заяц. Ні з кім не сварыўся, ні з кім не спрачаўся. Блізка ад яго, пад ядлоўцавым кустом, пасяліўся Вожык. Памяркоўны звярок, нікому вока не запарушыў. Пазнаёміліся Заяц і Вожык, пачалі разам гуляць. Убачыла іх Вавёрка і рассмяялася: такія яны розныя — сябры. Заяц вялікі, імчыцца, нібы вецер. А Вожык маленькі, павольны, як чарапаха.

— Нядоўга вы будзеце сябраваць, — зацокала Вавёрка. — Лопне ваша дружба пры першай нягодзе, як бурбалка дажджавая.

— Пажывём — пабачым, — сказалі Вожык і Заяц.


Правообладатель Национальный институт образования



Аднаго дня ў лес прыйшла бяда. Галодны Воўк убачыў зяркоў і ўзрадаваўся: адразу з'есць Вожыка, а потым, калі прыбавіцца сілы, дагоніць Зайца.

— Ратуйцеся! Воўк-разбойнік набліжаецца! — трывожна зацокала Вавёрка.

Заяц стаў на задзнія лапкі і ўбачыў драпежніка, які прытаіўся ў кустах.

— Уцякай, Вожык! — крыкнуў ён і даў драпака.

Што далей можа здарыцца з Зайцам і Вожыкам? Ці ўратуюцца яны ад Ваўка? Якім чынам?

У Вожыка ножкі кароценькія — не ўцячы яму, небараку. Таму ён скруціўся ў клубочак, выставіў свае вострыя іголкі і замёр.

— Вось і скончылася ваша дружба! — зацокала Вавёрка. — Сапраўдныя сябры ў бядзе пазнаюцца.


Правообладатель Национальный институт образования

А Воўк ударыў лапай Вожыка і аж заскуголіў ад болю — аб іголкі ўкалоўся.

Тым часам вярнуўся Заяц, каб неяк дапамагчы сябру. Воўк кінуў Вожыка — і за ім, даўганогім. Заяц зрабіў па лесе круг, другі. Не адстае Воўк, следам імчыцца. Чуваць толькі шумнае дыханне ды цяжкі тупат. І раптам... як заенчыць Воўк, як завые на ўвесь лес! Гэта Вожык кінуўся яму пад ногі, і драпежнік зноў параніў аб калючкі нагу.

Пакачаўся Воўк па зямлі, рану залізаў і неахвотна паплёўся прэч — адступіўся ад звяркоў.

Вавёрка ўсё гэта бачыла. Яна спусцілася з яліны да Вожыка і Зайца, зацокала вінавата:

— Даруйце, што смяялася з вас. Цяпер ведаю: вы — сапраўдныя сябры.




1. Складзіце па змесце казкі некалькі пытанняў са словамі *хто, што, дзе, калі, каму, як*. Задайце іх адно аднаму, праслухайце і ацаніце адказы.
2. Якімі рысамі характару надзяліў аўтар галоўных герояў казкі?
3. Патлумачце сэнс выразу пра характар Вожыка — «нікому вока не запарушыў».
4. Чаму Вавёрка сумнявалася ў дружбе паміж Зайцам і Вожыкам?
5. Знайдзіце ў творы сказ, у якім адлюстравана асноўная думка гэтай казкі.


Правообладатель Национальный институт образования

 

**6.** Падзяліце казку на сэнсавыя часткі. Дайце ім загалоўкі. Перакажыце змест у адпаведнасці з планам.

### ПРЫКАЗКІ ПРА ДРУЖБУ

- З кім павядзешся, ад таго і набярэшся.
- Не той друг, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа.
- Новых сяброў набывай, а старых не забывай.
- Дружба не заўсёды салодкая служба.
- Чалавек без сяброў, што дрэва без каранёў.
- Чалавек без сябра, што яда без солі.

## Паўтараем, падагульняем, разважаем...

***Ведаем...***

1. Якія з названых твораў з'яўляюцца казкамі, якія — вершам, які — байкай?

а) «Фанабэрысты Мухамор»;
б) «Стары бацька»;
в) «Калыханка маме»;
г) «Верныя сябры».

2. Вылучыце галоўных герояў з ліку названых. З якіх яны твораў?

а) Сын, стары бацька, суседзі;
б) Заяц, Вожык, Вавёрка і Воўк;
в) Вожык, яго матуля і дзяўчынка;
г) Мухамор і Падасінавічак.


Правообладатель Национальный институт образования